■ «Узаемадзеянне-2013»

# МЭТЫ — ВЫКАНАНЫ, АЦЭНКА ВЫСОКАЯ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сёння возьме ўдзел у сумесным стратэгічным вучэнні ўзброеных сіл Беларусі і Расіі «Захад-2013». Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара. Як чакаецца, удзельнічаць у мерапрыемстве будзе таксама Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі Уладзімір Пуцін.**

**Плануецца, што кіраўнікі дзяржаў наведаюць Гожскі палігон у Гродзенскай вобласці Беларусі і ваенны палігон Хмялёўка Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі ў Калінінградскай вобласці Расіі.**



**Скончылася актыўная фаза сумеснага вучэння «Узаемадзеянне-2013» Калектыўных сіл аператыўнага рэагавання дзяржаў — удзельніц Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы, якое праводзілася ў рамках стратэгічнага вучэння "Захад-2013". Нягледзячы на дажджлівае надвор'е, учора на палігоне «Асіповіцкі» было па асабліваму горача.**

Паводле задумы вучэння, у адной з дзяржаў — удзельніц АДКБ адбылася дэстабілізацыя абстаноўкі. Прычына — узрастанне актыўнай дзейнасці дыверсійных фарміраванняў, міжнародных тэрарыстычных арганізацый і наёмніцкіх структур. Саветам калектыўнай бяспекі АДКБ было прынята рашэнне па аказанні гэтай дзяржаве ваеннай і ваенна-тэхнічнай дапамогі.

Адзін з магчымых варыянтаў узнікнення крызіснай сітуацыі адпрацоўвалі аператыўныя групы і вайсковыя кантынгенты ўзброеных сіл Арменіі, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана, Расіі і Таджыкістана. Удзельнікі вучэння рабілі захады па дэблакіраванні аэрадрома, штурме будынка і вызваленні закладнікаў. Падраздзяленні шматнацыянальнай групоўкі вартавалі важныя дзяржаўныя аб'екты, вялі разведку мясцовасці, шукалі незаконныя ўзброеныя фарміраванні, арганізоўвалі і праводзілі засады.

— Не магу не адзначыць высокі ўзровень падрыхтоўкі ўсіх катэгорый вайскоўцаў, якія прымалі ўдзел у вучэнні: як афіцэраў упраўлення, так і звычайных салдатаў, — адзначыў **міністр абароны Беларусі генерал-лейтэнант Юрый ЖАДОБІН.** — Безумоўна, арганізоўваючы гэтае вучэнне, мы ставілі перад сабой некалькі мэт. Мне здаецца, што атрыманы вопыт будзе карысны не толькі для Узброеных Сіл нашай краіны, а і для ваенных ведамстваў нашых саюзнікаў. Гэта, безумоўна, уносе пэўныя карэктывы і ў аператыўную падрыхтоўку падраздзяленняў і часцей.





Асаблівасць вучэння — аднαчасовае сумеснае прымяненне двух складнікаў сістэмы калектыўнай бяспекі АДКБ — Рэгіянальнай групоўкі войскаў Беларусі і Расіі і Калектыўных сіл аператыўнага рэагавання АДКБ. Упершыню ў рамках АДКБ адбылося дэсантаванне парашутным спосабам самаходных артылерыйскіх установак.

— Вучэнні паказалі высокую зладжанасць і ўзаемадзеянне краін — удзельніц АДКБ, — падкрэсліў **начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі — першы намеснік міністра абароны Расіі генерал арміі Валерый ГЕРАСІМАЎ.** — У наступным годзе такія вучэнні пройдуць на тэрыторыі Казахстана, дзе будуць адпрацаваны пытанні аператыўнага рэагавання на тыя пагрозы, якія могуць узнікнуць у любой дзяржаве — удзельніцы АДКБ. Хутчэй за ўсё, мы адпрацуем і тыя пытанні, якім няшмат увагі надавалася ў папярэдніх вучэннях. Гэта, перш за ўсё, фарміраванне кантынгенту і перапраўка яго ў раён аператыўнага рэагавання.

— Арганізацыяй Дагавора АДКБ у апошні час вялікая ўвага надаецца развіццю і ўдасканаленню Калектыўных сіл аператыўнага рэагавання, — зазначыў **міністр абароны Арменіі Сейран АГАНЯН.** — Гэтыя вучэнні паказалі, што мы выбралі правільны кірунак. Тыя мэты, якія ставіліся напярэдадні вучэння, цалкам выкананы. Мая ацэнка вучэння вельмі высокая.

Агульная колькасць удзельнікаў вучэння — 600 чалавек. Было задзейнічана каля 60 адзінак баявой і спецыяльнай тэхнікі, а таксама да 15 адзінак авіяцыі. **Генеральны сакратар Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы Мікалай БАРДЗЮЖА** пракаментаваў апошняе рашэнне кіраўнікоў дзяржаў — удзельніц АДКБ, якое тычыцца дапамогі Таджыкістану:

— Размова ідзе пра ваенна-тэхнічную дапамогу. Гэта дапамога ўзбраеннем, сродкамі для аховы дзяржаўнай мяжы, экіпіроўкай для вайскоўцаў. Другі этап дапамогі — фарміраванне міждзяржаўнай праграмы, якая тычыцца тэхнічнага аснашчэння мяжы з Афганістанам. Размовы аб якой-небудзь ваеннай дапамозе ці аб перакідванні туды ваеннага кантынгенту не ідзе. У гэтым пакуль няма неабходнасці.

Напрыканцы практычных дзеянняў войскаў адбылося ўрачыстае ўзнагароджанне тых ваеннаслужачых, якія паказалі добрыя вынікі падчас вучэння.

**Вераніка КАНЮТА. Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**
*Асіповіцкі раён*

# БЕЛАРУСКІ ПОГЛЯД З ВІЛЬНЮСА

**У Вільнюсе, у галерэі Саюза мастакоў Літвы, адкрылася выстава сучасных беларускіх майстроў мастацтва «Погляд Беларусі». Экспазіцыя ўключае творы беларускіх мастакоў, якія жывуць і працуюць у Літве.**



Вільня здаўна была адным з цэнтраў духоўнасці і мастацтва беларусаў. Сцены былой Віленскай народнай школы малявання памятаюць такіх славутых мастакоў беларускага паходжання, як Хаім Суцін, Міхаіл Кікоін, Павел Крэмень, Роберт Генін...

«Нас радуе гэта выстава, яе мастацкі ўзровень. Беларускія мастакі, якія жывуць у Літве, яшчэ раз паказалі свой творчы патэнцыял. Ён высокі, шматгранны, арыгінальны. Мы бачым работы сапраўдных майстроў», — сказала на адкрыцці выставы **старшыня Саюза мастакоў Літвы Эдзіта Утарыене** *(на фота ў цэнтры).*

Свае работы прадставілі многія вядомыя беларускія мастакі. Нельга прайсці міма палотнаў цудоўнага майстра жывапісу Уладзіміра Голуба. Яго творы немагчыма зблытаць з іншымі аўтарамі. Калі вы ўбачыце іх, то заўсёды будзеце ведаць, чые гэта карціны. Камбінаваць рэалізм і фантастычны свет, ствараць загадкавыя і ў той жа час пазнавальныя вобразы, размалёўваць рэчаіснасць казачнымі фарбамі — вось характэрная асаблівасць работ Уладзіміра Голуба.

Ён нарадзіўся ў Слуцку. Вось ужо шмат гадоў жыве ў Вільнюсе, але са сваёй Айчынай падтрымлівае вельмі цесныя сувязі. Уладзімір Голуб — член Саюза мастакоў Беларусі, работы майстра знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, у Фондзе Саюза мастакоў Рэспублікі Беларусь і ў іншых музеях Беларусі, як і ў многіх галерэях сучаснага мастацтва розных краін свету.

«У мяне вы знойдзеце ўсё тое, што не модна цяпер у мастацтве: сюжэтнасць з налётам літаратурнасці, сімвалічнасць, алегарычнасць... Я па-ранейшаму ідэнтычны самому сабе», — кажа Уладзімір Голуб.

Цікавыя палотны і братоў Аляксандра і Сяргея Пакладаў. Яны абодва нарадзіліся ў вёсцы Кажамякіна Краснапольскага раёна Магілёўскай вобласці. І хоць цяпер жывуць і працуюць у горадзе, іх сюжэты, здаецца, нават пахнуць вёскай, настолькі яны шчырыя, выкананыя з любоўю да вясковага побыту.

Мастакі Анджэй Балаховіч і Наталля Рабчук нарадзіліся ў Вільнюсе. Але ў Анджэя захавалася дзівосная сувязь з прыродай. Яго пейзажы светлыя, цёплыя. Наталля, наадварот, уся агорнута чарамі старога Вільнюса.

«Якім я бачу стары Вільнюс? Гэта адчуванне дому, настальгія па дзяцінстве. У старым горадзе мне заўсёды добра і ўтульна. У карціну са старым горадам укладаюцца ўспаміны з дзяцінства, гістарычнае асэнсаванне, узрослае з гадамі, а таксама мастацкае ўспрыманне і мастацкая тэхніка. Калі ўсё атрымалася — карціна «гучыць», грэе душу, — гаворыць Наталля Рабчук. — Храмы Вільнюса — упрыгажэнне старога горада. Але гэта не проста будынак — гэта Дом Божы. Таму ў работу ўкладаецца Адкрыццё, якое адбываецца ў маёй душы».

Выстава «Погляд Беларусі» наладжана па ініцыятыве Пасольства Рэспублікі Беларусь у Літоўскай Рэспубліцы пры падтрымцы Фонду Чурлёніса. Працягнецца яна да 3 кастрычніка. Дэвіз выставы — «Мастацтва без межаў». Думаю, што яе варта паказаць і ў Мінску.

**Вітаўтас ЖЭЙМАНТАС,**
**уласны карэспандэнт «Звязды»**
**ў Літве. Фота аўтара.**

■ Крымінал

## «АДДЗЯЧЫЎ» СВАЙГО «ВЫРАТАВАЛЬНІКА»

Сталічная міліцыя вышуквае мужчыну, які падазраецца ў рабаванні. Увечары ў краме па вуліцы Глебкі маладому чалавеку не хапіла нязначнай сумы грошай. Дапамог купюрамі чалавек, што стаяў у чарзе за ім. Пакупнік прапанаваў свайму «выратавальніку» разам выпіць, каб такім чынам аддзячыць таму. У двары бліжэйшага дома мужчыны распілі бутэльку гарэлкі, пасля чаго малады чалавек... збіў сабутэльніка, які толькі гадзіну таму прыйшоў яму на дапамогу, і забраў у яго грошы.

## У СТАЛІЦЫ ЗАБІЛІ ХЛОПЧЫКА

Каля пад'езда дома па сталічнай вуліцы Альшэўскага мінак знайшоў скрываўленае цела хлопчыка з нажавым раненнем у грудзі... Забітым аказаўся 13-гадовы мясцовы жыхар. А літаральна праз тры гадзіны падазраваны ў здзяйсненні злачынства быў затрыманы па месцы жыхарства і дастаўлены ў Фрунзенскі РУУС. Ім аказаўся 19-гадовы непрацуючы мінчанін, які злоўжываў наркатычнымі сродкамі. Супрацоўнікам крымінальнага вышуку ён ужо даў паказанні, у тым ліку расказаў, што нож — прыладу забойства — кінуў непадалёку ад месца злачынства.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


**ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ЗАО «Белкоммунстроймонтаж»,**
*опубликованной в газете «Звязда» 26.01.2013 г. № 16*
**строительства 20-этажного односекционного жилого дома со встроенно-пристроенными помещениями общественного назначения и гараж-стоянкой открытого типа в границах ул. Каховская – Оршанская – Орловская – Сморговский тракт, г. Минск:**
Для привлечения к строительству по договору создания объектов долевого строительства предлагаются нежилые помещения на 1-м этаже от 30 до 80 кв.м – 2000 (две тысячи) долларов США, свыше 80 кв.м – 1800 (тысяча восемьсот) долларов США; нежилые помещения в цоколе – 1650 (тысяча шестьсот пятьдесят) долларов США; 3 м/места в крытом паркинге по 35 000 (тридцать пять) долларов США.
**Дополнительную информацию можно получить по адресу: г. Минск, ул. Немига, 40, офис 704. Тел. 8 (017) 306 20 90, или у уполномоченных риэлторов (агентств недвижимости).**
УНП 101019973



Фермерское хозяйство «Савицкий В.В.», дело №264-7Б\2-007\5, Управляющий Журов В.А. (адрес: 247491, Гомельская обл., г. Речица, ул. Набережная, 110\12) Хозяйственный суд Гомельской области, УНП 490495377. Торги в форме конкурса по продаже имущества фермерского хозяйства «Савицкий В.В.», назначенные на 10.09.2013 **признаны несостоявшимися.**
УНП 490495377


■ Ну і ну!

# І КІНУЎ СЕЙФ У ВАДАСХОВІШЧА...

Супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку Партызанскага РУУС сталіцы затрымалі за крадзеж сейфа з офіса прыватнай кампаніі 24-гадовага мінчаніна.

— Малады чалавек вызваліўся з яе з-за пастаянных канфліктаў з кіраўніцтвам. Пасля гэтага грамадзянін вырашыў «аднавіць справядлівасць». Прыехаўшы позна ўначы, хлопец выбіў акно на першым паверсе будынка і праз яго трапіў унутр. У памяшканні прыхапіў металічны сейф, які пагрузіў у машыну і адвёз да Чыжоўскага вадасховішча, — паведаміла **прэс-афіцэр Партызанскага РУУС г. Мінска Ганна Чыж-Літаш.** — Тут зламыснік пры дапамозе «балгаркі» распілаваў сейф папалам, аднак унутры яго, акрамя дакументаў, кніг і пячатак, нічога не знайшоў. Гэта раззлавала хлопца яшчэ больш, і ён утапіў рэшткі сейфа ў вадасховішчы. Калі маладога чалавека затрымалі, высветлілася, што, акрамя металічнай скрыні, ён украў з офіса фірмы яшчэ і дарагі ноўтбук.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**